# ПРЭЗЕНТАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ КАМУНІКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭКІ ПА РАСПАЎСЮДЖВАННІ КРАЯЗНАЎЧЫХ ВЕДАЎ

***В. І. Саітава,*** *кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў;*
***С. В. Зыгмантовіч****, кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Сучасная бібліятэка як сацыяльна-камунікацыйны цэнтр развівае прамоцыю краязнаўчых ведаў, выкарыстоўваючы розныя віды і каналы камунікацый [1; 2; 3]. Гэтаму спрыяюць прымяненне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, падключэнне да сеткі Інтэрнет і іншыя тэхналагічныя сродкі, прафесійная падрыхтаванасць бібліятэчных спецыялістаў як да стварэння краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў, даследчай дзейнасці па краязнаўстве, так і да актыўнай іх прэзентацыі сярод карыстальнікаў бібліятэкі, рэгіянальнай супольнасці і ў свеце. Айчынныя бібліятэкі назапасілі буйныя структураваныя інфармацыйныя рэсурсы па краязнаўстве, якія адлюстроўваюць мясцовую гісторыю, культурны вопыт, актуальныя пытанні ўсіх бакоў жыцця рэгіёнаў бягучага часу. Гэта базы даных, паток паступаючых у бібліятэку дакументаў, рэсурсы інтэрнета, якія самі з’яўляюцца важным аб’ектам прамоцыі па розных камунікацыйных каналах. Краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы ствараюць падставу для развіцця ўсіх іншых відаў зносін бібліятэкі з карыстальнікамі і насельніцтвам, напрыклад, падрыхтоўкі і правядзення масавых мерапрыемстваў. Прызнана, што прамоцыя бібліятэкамі ведаў аб краі спрыяе фарміраванню прывабнага сацыякультурнага і эканамічнага іміджу рэгіёнаў і населеных пунктаў краіны. Таму бачыцца актуальным вызначэнне асобнага прэзентацыйнага кампанента ў камунікацыйнай дзейнасці бібліятэкі, асноўныя складнікі якога характарызуюцца ніжэй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Выставачная работа.* У сістэме выстаў, якія фарміруюць бібліятэкі, галоўнае месца займаюць кніжныя выставы краязнаўчых дакументаў і выставы прадметаў, якія належаць да культурных каштоўнасцей рэгіёна. Ствараюцца самастойныя кніжныя выставы і выставы ў кантэксце масавых мерапрыемстваў; па змесце ўніверсальныя, тэматычныя, персанальныя; па мэтавым прызначэнні ў дапамогу папулярызацыі краязнаўчых ведаў, навукова-даследчай і адукацыйнай дзейнасці. Для папулярызацыі краязнаўчых дакументаў часцей за ўсё выкарыстоўваюць выставы новых паступленняў, тэматычныя і персанальныя выставы. Сярод тэматычных распаўсюджаны выставы да знамянальных дат. У многіх бібліятэках арганізуюць комплексныя доўгатэрміновыя выставы, прысвечаныя рэгіёну, тыпу: «Ведай свой край», «Край мой, ты – часціца Радзімы», «Ці ведаеце вы свой горад?» і інш. Папулярнымі з'яўляюцца выставы-прэм'еры, выставы прэзентацыі адной краязнаўчай кнігі, выставы «Лепшыя кнігі аб краі» і інш.

Часам бібліятэкі рэалізуюць выставачныя праекты, калі сацыяльна-значная тэма прэзентуецца ў шэрагу этапаў, як напрыклад, выставачны праект Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «Малая радзіма – аповесць часоў», дзе ў серыі мастацкіх і інфармацыйна-дакументальных выстаў ужо былі прадстаўлены багатыя калекцыі паштовак, кніг і фатаграфій вядомых калекцыянераў У. Ліхадзедава, С. Плыткевіча і інш.

Усё часцей выставы праводзяцца па-за сценамі бібліятэк, таму што ўключаюцца ў склад розных культурных мерапрыемстваў. Так, усе бібліятэкі краіны актыўна ўдзельнічаюць у святкаванні Дня Перамогі 9 мая – адной з самых вялікіх дат у гісторыі беларускага народу. Сярод разнастайных форм ушанавання гэтай даты бібліятэкі прапануюць выставы. Напрыклад, у 2017 г. на літаратурна-краязнаўчай пляцоўцы «Наш горад Бабруйск дарогай Перамогі» раённая бібліятэка арганізавала кніжна-ілюстрацыйную і фотавыставу. Яны сталі арганічнымі элементамі літаратурна-музычнай кампазіцыі «Вясна Перамогі» з удзелам баб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

руйскіх паэтаў і іншых мерапрыемстваў. З 2010 г. з мэтай патрыятычнага выхавання і пашырэння ведаў аб Вялікай Айчыннай вайне ў бібліятэцы рэалізуецца праект «Франтавая агітпалатка», у аснове якога разнастайная выставачна-экспазіцыйная дзейнасць. Наведвальнікі агітпалаткі знаёмяцца з кнігамі, газетамі, улёткамі, рэдкімі фатаграфіямі, архіўнымі дакументамі, прысвечанымі падзеям вайны, гераічнаму змаганню бабруйчан з ворагамі, абменьваюцца ўражаннямі і меркаваннямі.

У наш час бібліятэкі актыўна ствараюць віртульныя краязнаўчыя выставы, якія не толькі выдатна адлюстроўваюць дакументы з фондаў, але і змяшчаюць спасылкі да рэсурсаў інтэрнета, звязаных з тэматыкай выставы. Гэта дэманструюць, напрыклад, віртуальныя выставы Магілёўскай абласной бібліятэкі: «Магілёўшчына ў гады Першай сусветнай вайны», «Беларусы свету з Магілёўшчыны», «Могилевская губерния на страницах периодических изданий» і інш.

Вялікая ўвага надаецца арганізацыі выстаў мясцовага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, экспазіцыі аўтарскіх работ. Напрыклад, Маларыцкая Цэнтральная раённая бібліятэка звыш 5 гадоў рэалізуе арт-праект «Свет хобі», у межах якога рэалізуюцца выставы аматараў мастакоў і майстроў рэгіёна. У 2018 г. былі праведзены выставы эксклюзіўных лялек, кавальскіх работ, вышытых карцін, вырабаў з паперы, бісеру, гліны і інш.

Цікавасць чытачоў выклікаюць *прэзентацыі* (у тым ліку мультымедыйныя) і *прэм'еры к*раязнаўчых кніг. Нярэдка на іх прысутнічаюць аўтары.

*Музеі, галерэі ў бібліятэках.* Культуратворчая дзейнасць бібліятэкі заключаецца ў падтрымцы і папулярызацыі дакументальных і рэчавых помнікаў, традыцый рэгіянальнай культуры, мясцовых талентаў: мастакоў, фатографаў, літаратурных творцаў, музыкантаў, акцёраў, народных майстроў. Гэта дзейнасць праяўляецца ў арганізацыі музеяў, музейных залаў (сектараў, аддзелаў), музейных экспазіцый на абанеменце ці ў чытальнай зале, у бібліятэчных холах, бібліятэк-музеяў, галерэй, літаратурна-мастацкіх салонаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інш. Музеі і галерэі ў бібліятэках прываблiваюць людзей сваёй даступнасцю, магчымасцю паглыбіць веды, звярнуўшыся да крыніц бібліятэчнага фонду. Усе яны створаны выключна па ініцыятыве бібліятэкараў. У склад прадметаў музейных фондаў уваходзяць прадметы побыту, працы, вопраткі, характэрныя для рэгіёна, экзэмпляры расліннага свету і іншыя рэчавыя крыніцы, а таксама пісьмы, дзённікі, альбомы, фотадакументы, выданні, гука- і відэазапісы бясед са старажыламі, знакамітымі землякамі, запісамі мясцовых музычных калектываў.

Многія краязнаўчыя музеі захоўваюць і папулярызуюць комплексную інфармацыю аб мінулым і сучаснасці рэгіёна, населенага пункта. Цікавым прыкладам этнаграфічнага музея з’яўляецца «Ельскі фартушок» у Ельскай раённай цэнтральнай бібліятэцы. Гэта пастаянная этнаграфічная экспазіцыя налічвае праз звыш 400 вышытых прадметаў народнага побыту і элементаў народнага касцюма. Экспазіцыя займае 72 кв. м. Цікава, што інтэнсіўная работа па збіранні матэрыялу, яго вывучэнні, папулярызацыі гісторыі, культуры і традыцый рэгіянальнай супольнасці садзейнічала ўзнікненню свята рушніка, якое штогод у маі праводзіцца бібліятэкай. У Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы адкрыты мемарыяльна-выставачная зала І. Х. Каладзеева і гісторыі вайны 1812 года. Прадстаўлены планы, карты, дакументы і матэрыяльныя прадметы па гісторыі населенага пункта другой паловы XIX – пачатку XX ст. Асобны раздзел прысвечаны дзейнасці барысаўскіх клубаў ваенна-гістарычнай рэканструкцыі па перыяду напалеонаўскіх войнаў. Наведвальнікі могуць прымерыць элементы ўніформы, зрабіць фотаздымкі.

У Поразаўскай бібліятэцы-цэнтры краязнаўства (Свіслацкі раён) дзейнічае музейны пакой «Мастацтва гліны і агню», прысвечаны традыцыям вырабу ўнікальнай чорнай керамікі ў Поразаве.

Стварэнне музеяў малой радзімы ў бібліятэках пашыраецца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З музеямі ў бібліятэках ёсць магчымасць знаёміцца аддаленым карыстальнікам дзякуючы інтэрнет-доступу. Добрым прыкладам віртуальнага краязнаўчага музея стаў «Літаратурны музей пісьменнікаў Гомельшчыны», створаны супрацоўнікамі аддзела краязнаўства Гомельскай абласной бібліятэкі.

*Падрыхтоўка і выданне краязнаўчых матэрыялаў.* Усе бібліятэкі ствараюць разнастайныя краязнаўчыя публікацыі. Сярод іх творы мясцовых аўтараў, зборнікі мясцовых гаворак, даведнікі аб мясцовых тапонімах, помніках, выдатных людзях і іншая разнастайная фактаграфічная і бібліяграфічная інфармацыйная прадукцыя.

*Публікацыі ў СМІ, на сайтах бібліятэк і ў сацыяльных сетках* дазваляюць адлюстраваць мерапрыемствы, пазнаёміць з цікавымі краязнаўчымі выданнямі, запрасіць людзей да наведвання і ўдзелу. Акрамя таго публікацыі на старонках рэгіянальных і рэспубліканскіх газет і часопісаў, «Краязнаўчай газеты», у сацыяльных сетках, на радыё, рэгіянальных і рэспубліканскіх тэлеканалах, інтэрнет-парталах органаў мясцовага дзяржаўнага кіравання, узаемныя спасылкі з’яўляюцца інфармацыйным укладам у фарміраванне пазітыўнага іміджа рэгіёна, перакананняў і пачуццяў мясцовага насельніцтва звязаных з яго асаблівасцямі. Публічныя бібліятэкі, якія актыўна вядуць краязнаўчую работу, штогод публікуюць дзясяткі артыкулаў, ствараюць радыёвыпускі, удзельнічаюць у тэлерэпартажах, як, напрыклад, Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева. Прыкладам прызнання значымасці краязнаўчай дзейнасці бібліятэк, пазіцыяніравання бібліятэкі ў якасці вытворца і транслятара важкай краязнаўчай інфармацыі, фарміравання прадстаўленняў аб тэрыторыі вобласці як гістарычнага і культурнага цэнтра з’яўляецца даступнасць «Галерэі знакамітых асоб “Легенды Гродзеншчыны”» Гродзенскай абласной бібліятэкі з галоўнай старонкі партала Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта.

Камунікацыйны падыход значна пашырае навуковыя магчымасці вывучэння з’яў і напрамкаў дзейнасці біб-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліятэк, абумоўлівае неабходнасць тэарэтычнага асэнсавання камунікацыйнага зместу і камунікацыйных функцый бібліятэкі ў новых умовах. Часцей за ўсё менавіта напрамкі краязнаўчай дзейнасці, рэгіянальныя праекты ініцыіруюць навацыі ў дзейнасці бібліятэк, у тым ліку і камунікацыйнай. Сацыяльна-камунікацыйная дзейнасць бібліятэкі ажыццяўляецца на падставе патрэбнасцей і рэсурсаў рэгіёна і накіравана, з аднаго боку, на забеспячэнне свабоднага абмена інфармацыяй і ведамі, садзейнічанне сацыякультурнаму і духоўнаму ўзбагачэнню насельніцтва рэгіёна, а з другога, звязана з рэкламай бібліятэкі, фарміраваннем яе камунікацыйнага іміджу, павышэннем важнасці бібліятэк у дасягненні задач сацыякультурнага развіцця рэгіёна, наладжваннем цеснага ўзаемадзеяння з іншымі суб'ектамі камунікацыйнай прасторы рэгіёна.

Дзякуючы ўзмацненню камунікацыйнага напрамку дзейнасці ўзвысіцца ўяўленне аб бібліятэцы як адным з гісторыка-культурных дасягненняў рэгіёна. Адметнасць яе як суб'екта камунікацыйнай прасторы рэгіёна звязана з тым, што яна з'яўляецца захавальнікам, распаўсюджвальнікамі нацыянальна-культурных традыцый, мясцовага культурнага вопыта, сямейна-грамадскіх каштоўнасцей, якія ўваходзяць у скарбніцу чалавечай камунікацыі. І ў той жа час выкарыстанне краязнаўчага рэсурса з'яўляецца важнай складаючай працэса фарміравання сацыякультурнай прывабнасці рэгіёна. Таму разнастайнасць і развіццё краязнаўчых напрамкаў дзейнасці бібліятэк – гэта шлях узбагачэння інфармацыйна-камунікацыйнага патэнцыялу як бібліятэкі, так і рэгіёна, краіны.

---

1. *Дворкина, М. Я.* Библиотечно-информационная деятельность. Теоретические основы и особенности развития в традиционной и электронной среде / М. Я. Дворкина. – М. : ФАИР, 2009. – 256 с. – (Специальный издательский проект для библиотек).

2. *Кормишина, Г. М.* Имиджевые коммуникации в системе социального взаимодействия [Текст] / Г. М. Кормишина // Библиотечное дело – 2010: интеграция в мировое образовательное пространство: материалы пятнадцатой междунар. науч. конф. (Москва, 28–29 апр. 2010 г.) : в 2 ч. – М., 2010. – Ч. 1. – С. 171–175.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Кормишина, Г. М.* Коммуникационная культура библиотек [Текст] / Г. М. Кормишина, С. Д. Бородина. – М. : Либерея-Бибинформ, 2008. – 128 с.

# ЗВУК В КИНО

***К. В. Салеев,*** *выпускник Белорусской государственной академии искусств;*
***В. А. Салеев,*** *доктор философских наук, профессор, главный научный сотрудник Белорусской государственной академии искусств, заслуженный деятель культуры Республики Беларусь*

В реальном мире звук окружает нас со всех сторон. Человеческая речь представляет собой, прежде всего, звуковое общение людей.

И, конечно, особняком стоит проблема музыки как уникального искусства. Музыка представляет собой упорядоченный, специально организованный, специально организованный звук, наделенный, как правило, глубоким эстетическим содержанием и выразительной привлекательностью формы.

Музыка впрямую обращается к чувствам человека, ее воздействие на человека огромно (вспомним, что согласно известному древнегреческому мифу, выдающийся музыкант Орфей благодаря своей блестящей игре практически выводит любимую Эвридику из царства мертвых). Музыка как искусство не только существует в суверенном статусе, она активно помогает в создании художественного образа и другим видам искусства, активно вступает в синтез с ними.

Это, на наш взгляд, особенно наглядно представлено в киноискусстве.

Кино в своем «немом» варианте достигло зрелости, выработало свою эстетику и творческие приемы, введение звука, казалось, рушило всю уже «укомплектованную» художественную систему. Именно поэтому вопрос «Нужен ли звук в кино?», как пишут киноведы в конце 1970-х го-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ